Жураў В.А., студ. гр. 404 ФК і СКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Спірына А.А.,
канд. культуралогіі

# КУЛЬТУРНАЯ І ГРАМАДСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА АНСАМБЛЯ ПЕСНІ І ТАНЦА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ Р.Р. ШЫРМЫ

Да 1939г. Р.Р.Шырма ўжо быў шырока вядомы на прасторах Заходняй Беларусі ў сваёй фальклёрнай, педагагічнай, грамадска-палітычнай і творчай дзейнасці. На гэты час ён быў знаёмы з шырокім колам вядомых паэтаў, кампазітараў,музыкаў, спевакоў і вельмі добрых сяброў з народа, якія неаднойчы падтрымлівалі ў розныя цяжкія гадзіны жыцця і творчай дзейнасці. У пошуках народных песенных скарбаў і самародных талентаў, ён пешшу прайшоў усю Заходнюю Беларусь, як і потым, пасля 1939, усю нашу краіну. А народ Беларусі, які так, як і Рыгор Раманавіч прагна любіў, шанаваў і па крупіцах збіраў беларускую народную песню нашчадкам, усе прайшлі праз яго, Шырмы, гасцінны парог і яго шчырае сэрца.

Рыгор Шырма валодаў зайздросным дарам згуртоўваць вакол сябе моладзь, абуджаць ў яе веру у свае сілы, здольнасці, веру ў лепшае будучае. У яго доме заўсёды можна было застаць то гімназістаў, якія прыходзілі са сваімі клопатамі, то студэнтаў якія часта збіраліся на рэпэтыцыі хору, якім кіраваў Рыгор Раманавіч, то розных хадакоў і землякоў, якія прыходзілі за кнігамі, за парадамі, то пачаткоўцаў – паэтаў, спевакоў, музыкаў.

Любоў да сваёй роднай беларускай песні спалучалася ў Рыгора Раманавіча з глыбокім разуменнем яго значэння ў развіцці культуры беларускага народа, ва ўмацаванні братэрскіх сувязей паміж народамі. Ён рабіў усё магчымае каб песня абуджала нацыянальную свядомасць нашага народа, заклікала да барацьбы за лепшую будучыню. Ён не толькі збірае і апрацоўвае народныя песні, але ўжо тады прыцягвае да іх майстэрскіх апрацовак, такіх выдатных кампазітараў, як Л. Грачанінаў, К. Галкоўскі, А.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кошыц, П. Гайваронскі, Т. Шэлігоўскі і многіх іншых, не толькі беларускіх, вядомых спевакоў і вуканаўцаў.

Да 1939 года Рыгор Шырма сабраў больш за тысячу беларускіх народных песень, мелодый і тэкстаў. Але якой бы не была шматграннай дзейнасць Шырмы ў розных галінах грамадскай дзейнасці і культуры, ён не адзін дзень не прыпыняў работу з хорам Беларускага саюза студэнтаў у Вільна, і праводзіў канцэрты ў бібліятэках, школах і іншых установах. Амаль такая газета, урадавага накірунку, як “Наше время” вымушана была прызнаць, што хору Шырмы удалося паказаць свае артыстычныя здольнасці і незвычайнае багацце беларускай народнай музычнай творчасці. Гэты хор з’яўляецца адным з лепшых віленскіх хароў (калі не самым лепшым).

Дзейнасць універсітэцкага хору была адным з яскравых праяўленняў грамадскай думкі яго кіраўніка, у спецыфічных для Заходняй Беларусі тых гадоў, калі белапольскімі ўладамі жорстка кантралявалася і каралася беларуская нацыянальная культура. Але, як бы там не было, а свет сонейка і яго цяпло ладонямі не закрыеш, яно ўсёроўна праб’ецца і нагадае пра сябе, так яно і здарылася.

У 1939 г. збыліся заветныя мары Рыгора Раманівіча Шырмы. Народны сход прадстаўнікоў працоўных Заходняй Беларусі пастанавіў 30 кастрычніка 1939 года аб’яднацца на векі са сваімі братамі з усходніх абластей у адзінай Савецкай Сацыялістычнай Дзяржаве. А 1 лістапада таго ж года Шырме быў уручаны мандат на арганізацыю ансамбля песні і танца – першага ў яго жыцці прафесійнага калектыва. 15 студзеня 1940 Беларускі ансамбль песні і танца, у колкасці 60 чалавек, пад мастацкім кіраўніцтвам Р.Р.Шырмы распачаў сваю работу. 23 студзеня ў Беластоку, у Доме Чырвонай арміі адбыўся першы канцэрт Беларускага ансамбля песні і танца. У праграму ўвайшлі папулярныя ў той час харавыя творы: “Песня о Сталине” А. Аляксандрава, б.н.п. “Ой, загуду” у апр. М. Гайваронскага і іншыя. Танцы: “Лявоніха”, “Крыжачок”, “Лянок”, “Мяцеліца”, “Чардаш” і іншыя былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадстаўлены вядомым у той час балетмайстрам І.Хворастам і прайшлі з вялікім поспехам.

У сакавіку 1940 года ансамбль актыўна ўключыўся ў абслугоўванне першых на тэрыторыі Заходняй Беларусі выбараў у Вярхоўны Савет СССР. Вызвалены народ Заходняй Беларусі ўпершыню выбіраў сваіх дэпутатаў у вышэйшы орган улады. У дні выбарў Беларускім ансамблем песні і танца было дадзена звыш 20 канцэртаў. Былі выпадкі, што давалі па 3, 4 канцэрты ў дзень. Так, 8 сакавіка, у Беластоку адбыліся канцэрты на выбарчых участках 65, 66, 69, 71, а 17 сакавіка на 73 і тэатры “Палас”. Артысты ж, з вялікай радасцю і  задавальненнем дарылі сваё музычнае мастацтва людзям, шчыра і адкрыта, нікога не баючыся, а слухачы ўпітвалі ў сябе гэтую чароўную асалоду, нібыта гаючае паветра ў казачным сасновым бары.

15 мая 1941 года ансамбль накіраваўся на гастролі ў РСФСР. А 18 мая 1941 года, у горадзе Шуя, Іванаўскай вобласці, у абласным клубе, адбыўся першы канцэрт ансамбля. 19-20 – у г.Каўроў, 25-26 – у г. Іванава. Усюды канцэрты праходзілі з вялікім поспехам. 21 мая 1941г.у Маскве, у Цантральным доме работнікаў мастацтва адбыўся прагляд канцэртнай праграмы і яе зацвярджэнне. У Маскве ансамбль працаваў да 10 чэрвеня 1941 года. А потым накіраваўся ў г. Падольск, Маскоўскай вобласці і гарады Бранск, Арджэнікідзэ, Карачоў. 22 чэрвеня 1941 ў горадзе Арол, Беларускі ансамбаль песні і танца спадкала **ВАЙНА**. Ў гэтым жа горадзе з ансамблем здарылася і яшчэ адна прыкрыя гісторыя. На канцэрце, у Доме Чырвонай арміі горада Арла, артысты, як звычайна, паказалі шмат беларускіх народных песен і танцаў. За гэта, з улікам ваеннага часу, Шырму абвінавацілі ў нацыяналізме і арыштавалі. Ансамбль тэрмінова накіравалі ў Маскву для вырашэння лёсу калектыва і яго кіраўніка. Пачаліся допыты, удакладненні, выклікі артыстаў у следчыя органы. У разгляд справы уключыўся беларускі Урад. 23 чэрвеня адбыўся Ўрадавы прагляд канцэртнай праграмы ансамбля, пасля чаго было вырашана калектыў захаваць, але цалкам змяніць рэпертуар. Шырму вызвалілі з пад варты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калектыў літэральна суткамі працаваў над новай праграмай. Яе прагляд супрацоўнікамі НКУС быў праведзены 29 чэвеня. Праграму ўхвалілі, і тым жа вечарам яна была паказана на зборным пункце для салдат, што адбывалі на фронт. Ансамбль пачаў абслугоўваць ваенкаматы Масквы, Маскоўскай вобласці. Рыгор Раманавіч наладжваў і падтрымліваў пастаянную сувязь з вядомымі кампазітарамі І.Дунаеўскім, А.Новікавым, М.Блантэрам ды іншымі, тэрмінова ўзбагачаў рэпертуар новымі творамі ваеннай тэматыкі. Рашэннем Урада у другой палове ліпеня, 18 – 20 1941 года, ансамбль разам з многімі іншымі калектывамі Масквы быў эвакуіраваны ў гарады Урала і Сібіры. Беларускі ансабль раскватэравалі ў Краснаярску, і ўжо 20 ліпеня там адбыўся канцэрт у чыгуначным клубе для воінаў Чырвонай арміі, якіх адпраўлялі на фронт. З 22 чэрвеня 1941 года па 31 снежня 1941 Беларускім ансамблем песні і танца было дано звыш 130 канцэртаў для воінаў Чырвонай арміі і працаўнікоў тылу, унешшым значны ўклад у перамогу савецкага народа над фашыскай Германіяй.

Спіс выкарастаннай літаратуры:

1. Шырма, Р.Р. Песня – душа народа / Р.Р. Шырма. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. – 400 с.

2. Ліцвінка, В. Дз. Рыгор Шырма / В.Дз. Ліцвінка. – Мінск: Беларусь, 1990. – 64 с.

3. Сізко, В. А. Песня на ўсё жыццё / В.А. Сізко.– Мінск: Мастацкая літаратура, 1983. – 346 с.

4. Жураў, А.В. Жыццё з песняй / А.В. Жураў. – Мінск: Бестпрынт, 2001. –224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ